Штодзённы клопат

Што такое сацыяльныя стандарты і для чаго яны патрэбныя

Найважнейшым напрамкам сацыяльнай палітыкі ў нашай краіне з'яўляецца сістэма дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартаў. Яна прадугледжвае мэтанакіраваную дзейнасць дзяржавы ў пытаннях гарантаванага і справядлівага задавальнення матэрыяльных і духоўных патрэб грамадзян. Па просьбе карэспандэнта «МС» намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па працы і сацыяльных пытаннях Людміла КАНАНОВІЧ падрабязна расказала пра тое, як працуе адпаведны закон, што спрыяе развіццю сістэмы гэтых стандартаў і чаму ў канцэптуальных новаўвядзеннях пакуль няма неабходнасці.

«Галоўная задача сістэмы — гэта павышэнне якасці жыцця і дабрабыту насельніцтва, — кажа дэпутат. — Пры гэтым асаблівая ўвага ўдзяляецца найбольш уразлівым катэгорыям — дзецям, ветэранам, пенсіянерам, інвалідам, шматдзетным сем'ям. Мінімальныя стандарты — гэта тая планка, адносна якой недапушчальна зніжаць аб'ём і якасць паслуг насельніцтву».

Прававая аснова для рэалізацыі сацыяльных стандартаў — гэта Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартах», прыняты ў 1999 годзе. Дарэчы, аказанне бясплатных і агульнадаступных сацыяльных паслуг гарантуецца дзяржавай за кошт фінансавання з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, а таксама дзяржаўных пазабюджэтных страхавых фондаў.

Што ўваходзіць у гэтую сістэму? Аплата працы, пенсійнае забеспячэнне, адукацыя, ахова здароўя, культура, жыллёва-камунальнае абслугоўванне, сацыяльная падтрымка і сацыяльнае абслугоўванне.

«Час не стаіць на месцы, наша краіна дынамічна развіваецца, і з улікам практыкі прымянення заканадаўства ў галіне дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартаў у закон уносіліся змены ў 2003 і 2007 гадах, — нагадала Людміла Кананові. — Таксама ўрадам нашай краіны штогод прымаюцца пастановы, якімі ўмацоўваецца і ўдасканальваецца гэта сістэма».

Узяць, напрыклад, пастанову ўрада ад 25 жніўня 2017 года № 654: у прыватнасці, у сферы культуры скарэктаваны нарматыў забяспечанасці аграгарадкоў клубамі і бібліятэкамі. Гэта абумоўлена аптымізацыяй устаноў культуры ў сельскай мясцовасці, іх рэарганізацыяй (у тым ліку стварэннем арганізацый культуры змешанага тыпу). Што вельмі важна, усё адбывалася з улікам канкрэтнай сацыяльна-эканамічнай і дэмаграфічнай сітуацыі рэгіёнаў, дадала дэпутат.

«Умовы і парадак устанаўлення дзяржаўных мінімальных стандартаў рэгулююцца Працоўным і Жыллёвым кодэксамі Рэспублікі Беларусь, змяненні і дапаўненні ў якія ўжо разгледжаны парламентарыямі ў першым чытанні, і цяпер ідзе вялікая напружаная работа па падрыхтоўцы гэтых дакументаў да другога чытання, а гэта работа ў профільных камісіях, правядзенне круглых сталоў, абмеркаванне з нашымі выбаршчыкамі ў акругах магчымых змяненняў і дапаўненняў. І вельмі прыемна адзначыць, што нашы грамадзяне ў гэтым пытанні займаюць актыўную пазіцыю», — падкрэсліла Людміла Кананові.

Трэба разумець, што на захаванне канстытуцыйных правоў грамадзян у гэтай галіне накіраваны не толькі закон аб мінімальных сацыяльных стандартах, але і мноства іншых заканадаўчых актаў — аб пражытковым мінімуме, аб пенсійным забеспячэнні, аб адукацыі і гэтак далей.

Па словах дэпутата, на далейшае развіццё сістэмы дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартаў, рост іх узроўню і эфектыўнасці накіраваны наступныя механізмы: разняволенне прадпрымальніцкай ініцыятывы, стварэнне камфортных умоў вядзення бізнесу, надзейных эканамічных стымулаў праз развіццё інвестыцыйнай прывабнасці нашай краіны, удасканаленне дзяржаўна-прыватнага партнёрства і лічбавай эканомікі. Важна прыцягваць да ўдзелу па ўкараненні гэтай сістэмы камерцыйныя арганізацыі, індывідуальных прадпрымальнікаў і грамадскасць.

«На сённяшні дзень пакуль не ідзе гаворкі пра нейкія канцэптуальныя новаўвядзенні ў закон аб мінімальных сацыяльных стандартах, паколькі прынятая сістэма не страціла сваёй актуальнасці, а вось пытанні пашырэння сферы іх прымянення і павышэння іх якасці можна рэгуляваць падзаконнымі актамі, — упэўнена Людміла Кананові. — Што дадаць? На мой погляд, таксама можна разгледзець мінімальныя сацыяльныя стандарты ў галіне экалагічнай бяспекі».

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

«СТАНДАРТ» НА КОЖНЫ ДЗЕНЬ

Сацыяльныя пункты і мабільныя брыгады

У кожным раёне краіны працуюць тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва (іх усяго 146). Пра тое, што іх дапамога запатрабавана, сведчаць лічбы: па звестках на красавік 2018 года, на ўліку ў ТЦСАНах стаяла 1,9 мільёна грамадзян.

З іх амаль 90 тысяч абслугоўваюцца дома — на 611 чалавек больш, чым год таму. Бясплатна паслугі атрымліваюць 2,4 працэнта грамадзян — малазабяспечаныя адзінокія пенсіянеры і інваліды I і II групы. За частковую плату абслугоўваецца 18,2 %, за поўную — 79,4 %. Але трэба сказаць, што цана невысокая: адзін візіт сацработніка каштуе ў асноўным да двух рублёў.

Пры тэрытарыяльных цэнтрах дзейнічаюць аддзяленні, дзе могуць прыглядзець і за пажылымі, і за інвалідамі. Для апошніх адкрыта 280 рэабілітацыйна-працоўных майстэрняў, больш за 1,4 тысячы секцый па інтарэсах.

Каб забяспечыць даступнасць паслуг для сельскіх жыхароў, пашыраецца сетка сацыяльных пунктаў і філіялаў цэнтраў — сёння іх налічваецца каля 1,2 тысячы. Выязджаюць на дом таксама гаспадарчыя брыгады і брыгады сацыяльнага абслугоўвання. Яны могуць і траву ў двары пакасіць, і прадукты прывезці — усё, каб чалавек мог камфортна жыць дома, а не пераязджаць у інтэрнат.

Падтрымка сем'яў і ўразлівых катэгорый

Малазабяспечаныя грамадзяне могуць разлічваць на дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу. Яе выплачваюць тым, чый даход з аб'ектыўных прычын ніжэйшы за найбольшую велічыню бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва (на сёння гэта амаль 230 рублёў). У першым квартале 2018 года такую дапамогу выдзелілі 90,3 тысячы чалавек на суму 24,5 мільёна рублёў. З іх штомесячную сацыяльную дапамогу назначылі 23,7 тысячы чалавек, аднаразовую сацыяльную дапамогу — 12,3 тысячы, кампенсавалі затраты на набыццё падгузкаў — 39,4 тысячы, прадуктамі харчавання забяспечылі 14,9 тысячы дзяцей. У параўнанні з аналагічным перыядам летась колькасць атрымальнікаў выплат павялічылася на 1,9 працэнта, а сума аказанай дапамогі — на 17,4 працэнта.

> Дзяржаўны гарант у сферы аплаты працы — гэта мінімальны заробак. Цяпер гэта сума ў 305 рублёў.

Больш канкрэтна пра сумы. Сярэдні памер штомесячнай сацыяльнай дапамогі склаў 43,73 рубля на чалавека (за год ён вырас на 26 працэнтаў), аднаразовай — 138,73, кампенсацыі затрат на набыццё падгузкаў — 280 рублёў. Набор прадуктаў харчавання для дзяцей да двух гадоў каштаваў 61,73 рубля.

У асноўным сацыяльныя дапамогі выплачваюць шматдзетным і няпоўным сем'ям, якія выхоўваюць непаўналетніх дзяцей, — 61,7 % з ліку атрымальнікаў. Сярод сем'яў, якіх забяспечваюць прадуктамі харчавання, таксама лідзіруюць шматдзетныя — амаль 44 %.

У сістэму стандартаў уваходзяць і дапамогі ў сувязі з нараджэннем і выхаваннем дзяцей. Нагадаем толькі некаторыя з іх. Памер штомесячных выплат па доглядзе за дзіцем устанаўліваецца зыходзячы з сярэднямесячнага заробку ў краіне за другі і чацвёрты кварталы. На першага малога дапамога складае 312 рублёў, на другога і наступных — 356. Выплаты ў сувязі з нараджэннем дзіцяці больш істотныя. За першынца маці належыць 10 бюджэтаў пражытковага мінімуму (ці крыху больш за дзве тысячы рублёў), за наступных — 14 БПМ (ці амаль 2,9 тысячы).

Ацаніць працу кожнага

Дзяржаўны гарант у сферы аплаты працы — гэта мінімальны заробак. Цяпер гэта сума ў 305 рублёў — столькі належыць тым, хто заняты на поўную стаўку і добрасумленна выконвае абавязкі. Калі палучка работніка не дацягвае да стандарту, наймальнік абавязаны яму даплаціць.

Фота Анатоля КІПЕШЧУКА.

Сума невялікая. Яна, вядома, перавышае бюджэт пражытковага мінімуму, але не пакрывае мінімальнага спажывецкага бюджэту (гэта расходы на тавары і паслугі для задавальнення асноўных патрэб чалавека), які для працаздольнага насельніцтва складае каля 437 рублёў. З іншага боку, тыя, хто заняты на нізкааплатных работах без кваліфікацыі, могуць быць упэўненыя, што хоць бы столькі яны за сваю працу атрымаюць.

«Мінімалку» звычайна пералічваюць на пачатку кожнага года. Яна індэксуецца з улікам узроўню інфляцыі. Напрыклад, два гады таму мінімальны заробак раўняўся 240 рублям.

Дзяржава ўстанаўлівае таксама тарыфы аплаты працы. З іх дапамогай рэгулююцца заробкі ў бюджэтнай сферы. Адзіная тарыфная сетка ўлічвае розныя фактары і дазваляе атрымліваць больш тым спецыялістам, у каго вышэйшая кваліфікацыя, больш абавязкаў, вялікая фізічная ці інтэлектуальная нагрузка.

Што чакаць на пенсіі

Калі казаць пра пенсіі, то ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне розныя іх віды атрымліваюць больш за 2,5 мільёна чалавек. На працоўную пенсію па ўзросце цяпер маюць права жанчыны пасля 56 гадоў і мужчыны пасля 61. Агульны стаж работы для гэтага павінен складаць мінімум 20 і 25 гадоў адпаведна, а страхавы — 16 гадоў і 6 месяцаў. Для ўразлівых катэгорый планка іншая: бацькам дзяцей-інвалідаў, маці пяцярых дзяцей, інвалідам з дзяцінства дастаткова пяці гадоў страхавога стажу.

> Каб забяспечыць даступнасць паслуг для сельскіх жыхароў, пашыраецца сетка сацыяльных пунктаў і філіялаў цэнтраў — сёння іх налічваецца каля 1,2 тысячы.

Мінімальны памер працоўнай пенсіі на сёння — 191,03 рубля. Тым, хто дасягнуў 75 і 80 гадоў, устаноўлены даплаты — 38,73 і 51,65 рубля адпаведна. Сярэдні памер пенсіі па ўзросце цяпер складае 340,53 рубля.

А што, калі патрэбны стаж не ўдалося напрацаваць? У такім выпадку пажылых забяспечваюць сацыяльнымі пенсіямі, праўда, выплачваць іх пачынаюць пазней — жанчынам пасля 60 гадоў, мужчынам пасля 65. І памер меншы —103 рублі (для інвалідаў сумы вышэйшыя).

Каб падтрымаць уразлівыя катэгорыі, выплачваюць таксама пенсіі па страце карміцеля, па інвалідасці.

Памер працоўных пенсій карэктуецца мінімум раз на год — у сувязі з ростам сярэдняга заробку па краіне. Мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі, дабаўкі і павышэнні да іх, даплаты пажылым пасля 75 гадоў пераглядаюцца разам са змяненнем бюджэту пражытковага мінімуму.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)